АКЦЫІ

# ПАМЯЦЬ ЯК РУХАВІК ПРАГРЭСУ

**19 снежня 2024 года ў Гродзенскім дзяржаўным электратэхнічным каледжы адбылася тэматычная акцыя Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі – літаратурны ўрок мужнасці «Вечнай памяці слова».**

Сустрэча з моладдзю стала чарговым мерапрыемствам з шэрагу прысвечаных літаратарамі Прынёмання 80-й гадавіне вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Ад абласной пісьменніцкай арганізацыі творчы ўрок мужнасці правялі паэтэсы Кацярына Каламійцава і Вольга Алізар, а таксама паэт, публіцыст Дзмітрый Радзівончык. Ад навучальнай установы аўдыторыю склалі юнакі-навучэнцы, будучыя ўладальнікі такой неабходнай прафесіі электратэхніка, а таксама бібліятэкары каледжа.



Акцыя-урок мае некалькі мэтаў. Па-першае, з дапамогай твораў мастацкай літаратуры ў чарговы раз прыцягнуць увагу да трагічных і гераічных старонак гісторыі нашага народа. Гістарычная памяць беларусаў звязана са смуткам і болем ад шматлікіх страт, ахвяр фашызму. Таму мастацкае слова, вобраз, эмоцыя выкарыстоўваюцца як сродкі духоўнага ўзбагачэння, фарміравання пэўнага запасу мужнасці ў нашых маладых суграмадзян. Яшчэ сярод задач цыкла мерапрыемстваў ва ўстановах адукацыі горада Гродна – папулярызацыя сучаснай айчыннай літаратуры (якой недастаткова на старонках

падручнікаў) і Саюза пісьменнікаў Беларусі, якому сёлета споўнілася 90 гадоў. Установа адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны электратэхнічны каледж імя Івана Шчаснага» сёлета таксама юбіляр, рыхтуецца адзначыць сваё 85-годдзе.

Гісторыя кожнага калектыву, як і кожнай сям'і, кожнай краіны – не проста каляндарныя даты. Гэта сумленнае, беражлівае стаўленне чалавека да свайго мінулага, успрыманне яго ў якасці падмурка для жыцця сённяшняга і рухавіка для імкнення ў будучыню. Без увагі да памяці нельга дасягнуць развіцця – такая асноўная ідэя тэматычнай акцыі Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі – літаратурнага ўрока мужнасці «Вечнай памяці слова». Вайна пакінула свае смяротна-крывавыя шнары амаль на кожнай беларускай сям'і. Памятаць пра гэта – абавязак кожнага грамадзяніна. Каб кашмар не паўтарыўся, перад святой памяццю загінулых за нашу будучыню беларускае грамадства максімальна ўзмацняе шчыльнасць сваіх шэрагаў. У той час, калі ў вызваленай ад фашысцкіх катаў Еўропе знішчаюць помнікі савецкім воінам-вызваліцелям, нашым дзядам і прадзедам, у Беларусі шануюць іх неўміручы подзвіг. Менавіта таму ў змесце выступленняў гродзенскіх літаратараў на тэму вызвалення Беларускай зямлі ад фашысцкай навалы так выразна прагучалі сямейныя матывы.



Паэтэса Кацярына Каламійцава выступіла з дэкламацыяй твораў з разраду ваенна-патрыятычнай і грамадзянскай лірыкі, ідэйную аснову якіх складаюць тэмы дзяцей вайны, пераемнасці пакаленняў і матыў вечнай памяці. ...Паэтэса Вольга Алізар склала сваё выступленне з паэзіі на беларускай і рускай мовах. У цэнтры ўвагі аўтара – філасофія непераможнасці жыцця, матыў перавагі светлых сіл чалавечага духу над сіламі цемры, глыбокае вобразнае асэнсаванне ідэалогіі патрыятызму.

...Дзмітрый Радзівончык працягвае знаёміць гродзенцаў з нарысам пра свайго дзеда Пятра, ветэрана Вялікай Айчыннай, уладальніка баявых узнагарод, у тым ліку адной з самых паважаных і каштоўных – медалі За адвагу. Сустрэча праходзіла ў фармаце свабоднай сяброўскай гутаркі і выклікала ў маладзёжнай аўдыторыі шчырую зацікаўленасць. Гродзенскія пісьменнікі запрасілі навучэнцаў каледжа на свой афіцыйны сайт і прапанавалі пры неабходнасці ўсебаковую падтрымку. Напрыканцы мерапрыемства госці падзякавалі гаспадарам за ўвагу і апладысменты. У выніку сустрэчы ў фондзе бібліятэкі каледжа з'явіліся новыя кнігі, выдадзеныя Гродзенскім абласным аддзяленнем СПБ. Літаратурны ўрок мужнасці «Вечнай памяці слова» ў Гродзенскім дзяржаўным электратэхнічным каледжы скончыўся сумесным фатаграфаваннем і дамоўленасцю працягваць сяброўскія кантакты.

САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ
ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ

**На фота:** дэлегацыя Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі праводзіць літаратурны ўрок мужнасці «Вечнай памяці слова». Установа адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны электратэхнічны каледж імя Івана Шчаснага». 19 снежня 2024 года.













Дзмітрый
Радзівончык
Кацярына
Каламійцава
Вольга Алізар




У межах акцыі – прэзентацыі кніг









У падарунак каледжу – выданні ад сучасных гродзенскіх аўтараў

